РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама
10 сакавіка 2025 г. № 2

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXXIII рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

На абласны тур XXXIII рэспубліканскага конкурсу былі прадстаўлены 11 матэрыялаў ад наступных бібліятэк: Брэсцкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Брэсцкая РБС», Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя В. Ф. Праскурава ДУК «Ганцавіцкая РЦБС», Іванаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. І. Панфёрава ДУК «Іванаўская ЦРБ імя Ф. І. Панфёрава», Маларыцкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Маларыцкая РЦБС», Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая ЦГБ імя А.С. Пушкіна», Пінская гарадская цэнтральная бібліятэка ДУК «Пінская ГЦБС», ДУК «Кобрынская РЦБС», Пелішчанская сельская бібліятэка ДУК «Камянецкая РБС», Востраўская сельская бібліятэка ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», Целяханская гарпасялковая бібліятэка ДУК «Івацэвіцкая РБС», Ставокская сельская бібліятэка ДУК «Пінская РЦБС».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію Статута ўстановы культуры, фотаздымкі работ, дадаткі ў выглядзе электронных рэсурсаў і баз дадзеных, інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г. д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А. Я., калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць для ўдзелу ў XXXIII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».
Сярод гарадскіх бібліятэк:

Пінскую гарадскую цэнтральную бібліятэку ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Лагодзіч Дзіна Анатольеўна) – І месца за шматгранную працу па даследаванні, вывучэнні і папулярызацыі спадчыны партызанскага камандзіра В. З. Каржа і гераічнасці партызан Піншчыны праз сварэнне інфармацыйнага рэсурсу «Василий Корж – Герой Пинщины».

Дзяржаўную ўстанову культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Легацюк Ларыса Віктараўна) – ІІ месца за станоўчую работу па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны краю, ушанаванне імёнаў знакамітых землякоў праз рэалізацыю асветніцкага праекта «З маленькай вёскі – у вялікае жыццё»;

Маларыцкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Кузьміцкая Наталля Аляксееўна) – ІІІ месца за плённую працу па даследаванні матэрыялаў і папулярызацыю гістарычнай і сучаснай спадчыны Маларыцкага раёна праз стварэнне электроннага рэсурсу «Маленькі горад – вялікая гісторыя»;
Сярод сельскіх бібліятэк:

Востраўскую сельскую бібліятэку ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (загадчык Салавей Галіна Міхайлаўна) – І месца за шматгранную работу па зборы, сістэматызацыі і захаванні краязнаўчых ведаў, стварэнне інтэрактыўнага рэсурсу «Мястэчка Востраў: 500 гадоў гісторыі»;

Ставокскую сельскую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Парчук Вольга Васільеўна) – ІІ месца за значную работу па правядзенні даследаванняў аб ваенных падзеях, гісторыі помнікаў героям вайны на тэрыторыі Пінскага раёна.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:
Сярод гарадскіх бібліятэк:

Іванаўскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. І. Панфёрава ДУК «Іванаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. І. Панфёрава» (дырэктар Данількевіч-Федарашка Алена Іванаўна) – І месца за інавацыйны падыход да павышэння прываблівасці турыстычных аб'ектаў Іванаўскага раёна і стварэнне інфармацыйнага рэсурсу «Лабиринт времени».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання».
Сярод гарадскіх бібліятэк:

Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна» (намеснік дырэктара Голік Алена Васільеўна) – І месца за рознабаковую работу па далучэнні падрастаючага пакалення да чытання твораў сучасных беларускіх пісменнікаў праз рэалізацыю праекта «Дружим с книгой»;

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».
Сярод сельскіх бібліятэк:

Пелішчанскую сельскую бібліятэку ДУК «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма» (загадчык Жукава Жана Яўгенаўна) – І месца за плённую працу па выхаванні патрыятычных якасцей у падрастаючага пакалення, духоўна-маральным выхаванні, вывучэнні мінулага і захаванні гістарычнай памяці роднай зямлі.

2. Пераможцаў абласнога тура XXXIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі.

3. Прадставіць для ўдзелу ў XXXIII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

Пінскую гарадскую цэнтральную бібліятэку ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Востраўскую сельсую бібліятэку ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Іванаўскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. І. Панфёрава ДУК «Іванаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. І. Панфёрава»;

Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.С. Пушкіна ДУК «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна»;

Пелішчанскую сельскую бібліятэку ДУК «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А. Я.

Намеснік старшыні калегіі,
намеснік начальніка ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама А.М.Козіч